

Нядаўна, каб абмеркаваць сумесныя планы па ўвекавечанні спадчыны М.Кл. Агінскага і роду Агінскіх, члены праўлення мясцовага дабрачыннага фонду “Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага” сустрэліся з актывістамі Вілейскай суполкі Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

У час сустрэчы прадстаўнікі 3-сектару падзяліліся вопытам і дасягненнямі ў грамадзкай дзейнасці. У прыватнасці, валанцёры фодну расказалі аб добраўпарадкаванні месцаў пахавання адміралаў Канаржэўскіх, а таксама тэрыторыі вакол былога касцёла ў Аборку (гэта вёска звязана з сакратаром Міхала Клеафаса Агінскага Леанардам Ходзькай).

У сваю чаргу, вілейчане распавялі пра краязнаўчыя маршруты, распрацаваныя імі і звязаныя з жыццём і дзейнасцю аўтара паланэза “Развітанне з Радзімай”.

Вынік сустрэчы – шэраг мерапрыемстваў з нагоды 250-гадовага юбілею Міхала Клеафаса Агінскага вілейчане і маладзечанцы правядуць разам.

На фота: Да юбілею кампазітара – разам.